ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

**РЭГЛАМЕНТ**
**НАЗІРАННЯ ЗА ВЫБАРАМІ**
ў Каардынацыйную Раду IV склікання

23 сакавіка 2026 года г. Варшава

## 1. Агульныя палажэнні

1.1. Гэты Рэгламент вызначае парадак ажыццяўлення назірання за выбарамі ў Каардынацыйную раду IV склікання (далей — выбары), правы і абавязкі назіральнікаў, а таксама гарантыі іх дзейнасці.

1.2. Назіранне за выбарамі ажыццяўляецца з мэтай забеспячэння празрыстасці, падсправаздачнасці і даверу да выбарчага працэсу.

1.3. Назіранне за выбарамі ажыццяўляецца паводле прынцыпаў незалежнасці і бесстароннасці, адкрытасці і празрыстасці, недапушчэння ўмяшання ў выбарчы працэс, прапарцыянальнасці абмежаванняў, прыярытэту бяспекі ўдзельнікаў выбараў.

1.4. Назіранне за выбарамі грунтуецца на міжнародных стандартах, у тым ліку Капенгагенскім дакуменце АБСЕ 1990 года, Кодэксе добрай практыкі ў выбарчых пытаннях Венецыянскай камісіі, іншых агульнапрынятых прынцыпах дэмакратычных выбараў.

## 2. Суб’екты назірання

2.1. Назіральнікамі за выбарамі могуць быць:

2.1.1. грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія дасягнулі ўзросту 18 гадоў, вылучаныя грамадзянскімі ініцыятывамі і арганізацыямі;

2.1.2. прадстаўнікі выбарчых суб’ектаў;

2.1.3. запрошаныя Выбарчай камісіяй міжнародныя назіральнікі.

2.2. Назіральнікамі не могуць быць асобы, якія:

2.2.1. з’яўляюцца чальцамі Выбарчай камісіі і яе Сакратарыята;

2.2.2. непасрэдна ўдзельнічаюць ў тэхнічнай арганізацыі галасавання;

2.2.3. маюць канфлікт інтарэсаў, што ставіць пад сумнеў іх незалежнасць.

## 3. Акрэдытацыя назіральнікаў

3.1. Назіральнікі падлягаюць акрэдытацыі Выбарчай камісіяй.

3.2. Выбарчая камісія забяспечвае недыскрымінацыйную працэдуру акрэдытацыі, якая ўключае падачу адпаведнай заяўкі, яе разгляд і прыняцце рашэння.

3.3. Заяўка на акрэдытацыю падаецца не пазней за 14 дзён да пачатку галасавання ў электронным выглядзе праз адмыслова створаную форму, размешчаную на сайце Каардынацыйнай рады, і ўключае наступныя абавязковыя звесткі:

3.3.1. імя і прозвішча асобы;

3.3.2. кантактныя даныя;

3.3.3. назва арганізацыі, ініцыятывы або выбарчага суб’екта, ад якіх вылучана асоба, а таксама дакумент, які пра гэта сведчыць;

3.3.4.пацвярджэнне адсутнасці канфлікту інтарэсаў, прадугледжанага пунктам 2.2.3 гэтага Рэгламента;;

3.3.5. пацвярджэнне згоды з Рэгламентамназірання і Палітыкай бяспекі.

3.4. У выпадку запрашэння міжнародных назіральнікаў падача заяўкі можа ажыццяўляцца іншым чынам па ўгледжанні Выбарчай камісіі.

3.5. Выбарчая камісія правярае дасланыя звесткі на адпаведнасць патрабаванням Рэгламента, ажыццяўляе неабходныя дзеянні для іх спраўджання. Разгляд ажыццяўляецца без дыскрымінацыі, ацэнцы не падлягаюць палітычныя погляды заяўніка.

3.6. Па выніках праверкі Выбарчая камісія ў тэрмін 7 дзён з моманту атрымання заяўкі прымае адно з наступных рашэнняў:

3.6.1. аб акрэдытацыі назіральніка;

3.6.2. аб адмове ў акрэдытацыі назіральніка.

3.7. Акрэдытаваныя назіральнікі атрымліваюць пацвярджэнне акрэдытацыі, падпісанае Старшынёй Выбарчай камісіі.

3.8. Адмова ў акрэдытацыі дапускаецца ў наступных выпадках:

3.8.1. падача несапраўдных або недакладных звестак;

3.8.2. неадпаведнасць патрабаванням Рэгламента;

3.8.3. наяўнасць канфлікту інтарэсаў;

3.8.4. абгрунтаваныя рызыкі для бяспекі выбараў;

3.8.5. папярэднія грубыя парушэнні з боку заяўніка.

3.9. Адмова ў акрэдытацыі павінна быць выкладзена матываваным рашэннем Выбарчай камісіі і даслана на адрас заяўніка. Заяўнік мае права абскардзіць такое рашэнне у парадку, прадугледжаным пунктамі 13–18 Рэгламента працы Выбарчай камісіі.

## 4. Правы назіральнікаў

4.1. Назіральнікі маюць права:

4.1.1. назіраць за ўсімі этапамі выбарчага працэсу;

4.1.2. атрымліваць публічную інфармацыю і дакументы, звязаныя з выбарамі, акрамя тых, распаўсюд якіх стварае рызыкі бяспекі ўдзельнікаў выбарчага працэсу;

4.1.3. весці фіксацыю (аўдыё, відэа), калі гэта не парушае бяспеку;

4.1.4. накіроўваць заўвагі і паведамленні аб парушэннях у Выбарчую камісію;

4.1.5. публікаваць высновы назірання.

4.2. Рэалізацыя правоў назіральнікаў павінна ажыццяўляцца такім чынам, каб не парушаць таямніцу галасавання, не ствараць пагрозу для персанальных дадзеных, не перашкаджаць працы Камісіі.

## 5. Абавязкі назіральнікаў

5.1. Назіральнікі абавязаны дзейнічаць бесстаронне, не ўмешвацца ў выбарчы працэс, захоўваць канфідэнцыйнасць чуллівай інфармацыі, выконваць патрабаванні бяспекі.

## 6. Асаблівасці назірання ва ўмовах лічбавага галасавання

6.1. З улікам формы правядзення выбараў назіранне можа ажыццяўляцца дыстанцыйна.

6.2. Выбарчая камісія прымае неабходныя меры для забяспечэння трансляцыі адкрытых пасяджэнняў, публікацыі асноўных датычных выбараў дакументаў і апісання тэхнічных працэдур (у аб'ёме, які не шкодзіць бяспецы).

6.3. Назіранне за тэхнічнымі аспектамі галасавання (у тым ліку апрацоўкай дадзеных) ажыццяўляецца з улікам абмежаванняў, звязаных з кібербяспекай і абаронай персанальных дадзеных.

6.4. Камісія мае права абмежаваць аб'ём інфармацыі для распаўсюду, калі гэта стварае пагрозу ўзлому лічбавай платформы, можа прывесці да ідэнтыфікацыі выбаршчыкаў,

супярэчыць іншым патрабаванням бяспекі. Такія абмежаванні павінны быць прапарцыйнымі і абгрунтаванымі.

## 7. Абмежаванні дзейнасці назіральнікаў

7.1. Назіральнікам забараняецца:
7.1.1. ажыццяўляць агітацыю;
7.1.2. умешвацца ў працу Камісіі;
7.1.3. распаўсюджваць персанальныя даныя;
7.1.4. ствараць пагрозу бяспецы.

## 8. Скасаванне акрэдытацыі

8.1. Акрэдытацыя можа быць скасавана рашэннем Выбарчай камісіі ў выпадку:
8.1.1. грубага парушэння Рэгламента;
8.1.2. умяшання ў выбарчы працэс;
8.1.3. дзеянняў, якія пагражаюць бяспецы.

8.2. Рашэнне аб скасаванні акрэдытацыі павінна быць матываваным і прапарцыйным. Рашэнне дасылаецца заяўніку неадкладна, пры неабходнасці Выбарчая камісія паведамляе зацікаўленым бакам пра здарэнне і скасаванне акрэдытацыі.

8.3. Назіральнік мае права абскардзіць рашэнне аб скасаванні акрэдытацыі ў парадку, прадугледжаным пунктамі 13–18 Рэгламента працы Выбарчай камісіі.

## 9. Заключныя палажэнні

9.1. У выпадку канфлікту паміж прынцыпамі празрыстасці выбарчага працэсу і бяспекай яго ўдзельнікаў, Выбарчая камісія зыходзіць з прыярытэту бяспекі. Прымяненне абмежаванняў, абумоўленых меркаваннямі бяспекі, павінна быць абгрунтаваным, прапарцыйным, накіраваным выключна на прадухіленне рэальных пагроз. Спасылкі на меркаванні бяспекі не могуць выкарыстоўвацца для неабгрунтаванага абмежавання празрыстасці выбарчага працэсу або правоў яго ўдзельнікаў.

9.2. Пытанні, не ўрэгуляваныя гэтым Рэгламентам, вырашаюцца Камісіяй з улікам міжнародных стандартаў дэмакратычных выбараў.

9.3. Калі акрэдытаваны назіральнік або група назіральнікаў накіроўвае ў Камісію справаздачу аб выніках назірання, Камісія забяспечвае яе публікацыю на сайце Каардынацыйнай рады ў тэрмін 3 дзён з моманту атрымання. Камісія мае права суправадзіць публікацыю сваімі каментарамі.

**Старшыня Выбарчай Камісіі** **Алена Прыходзька**